## *МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІЯ, ФАЛЬКЛОР*

*УДК 008(476)*

*А. І. ЛАКОТКА*

# АКАДЭМІЧНАЯ НАВУКА – РАЗВІЦЦЮ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі*

*(Пастпупіў у рэдакцыю 26.11.2013)*

Станаўленне сучаснай суверэннай Беларусі выпала на складаны час глабальных крызісных з'яў, у якіх апынуўся свет пасля распаду СССР. Супярэчнасці паміж глабальным і нацыянальным, традыцыяй і мадэрнізацыяй, спажывецкім і духоўным ставяць пытанне аб ролі і значэнні гуманітарных навук у захаванні стабільнасці і далейшага развіцця сусветнай цывілізацыі. Міжэтнічныя і міжканфесійныя канфлікты, эканамічныя крызісы выклікаюць неспакой за захаванне маральных агульначалавечых каштоўнасцей, за трываласць падмурку, на якім стаяць спрадвечныя асновы асобы, грамадства, народа, чалавецтва.

Захаванне і развіццё народных традыцый, мовы, самасвядомасці сёння выступаюць гарантам устойлівага прагрэсу сучаснай гуманітарнай прасторы чалавецтва. Падмуркам фарміравання нацыянальнай дзяржаўнасці, эканомікі, культуры з'яўляюцца гісторыя, этналогія, фалькларыстыка, мовазнаўства, якія забяспечваюць развіццё патрыятызму, ідэйнай свядомасці, пачуццяў гордасці, высокага гістарычнага прызначэння народа: народа-пераможцы, народа-змагара, стваральніка сваёй будучыні.

Захаванне культуры і гісторыка-культурнай спадчыны – адзін з дзяржаўных прыярытэтаў. На IV Усебеларускім сходзе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падкрэсліў, што культура – неад'емны складнік суверэнітэту: «Дабрабыт нацыі, – сказаў Прэзідэнт, – вызначаецца яе эканамічным патэнцыялам. Зразумела, што без яго няма моцнай дзяржавы. Але і без развіцця духоўнай культуры таксама няма дзяржавы... Культура фарміруе дух нацыі! Вось чаму на пярэдні план ставіцца задача выхавання сумленнага чалавека, захавання і ўмацавання культурных і ідэалагічных асноў дзяржавы і грамадства» [6].

Беларускі народ стварыў за стагоддзі ўнікальны светапогляд пра прыроду і сусвет, пра чалавека і бытнасць. Народная творчасць, народна-традыцыйнае мастацтва, духоўныя традыцыі грунтуюцца на моўнай і рэлігійнай талерантнасці, лепшых традыцыях сямейнага і грамадскага побыту, святасці мацярынства, гонары працы, любові да бацькоўскай зямлі, Радзімы. Народ сучаснай незалежнай Беларусі – народ горды, адкрыты, гасцінны, па-сяброўску ветлівы для тых, хто ідзе да нас з мірам і дзелавымі прапановамі.

Але калі інжынерная думка і тэхналагічны прагрэс не ведаюць нацыянальных і дзяржаўных межаў, то гісторыю і мастацтва, мову і філасофскую думку беларусаў ніхто, акрамя нас, вывучаць не будзе. А без даследаванняў у сферы сацыяльна-гуманітарных навук немагчыма стварэнне мадэлі сацыяльна арыентаванага ўстойлівага інавацыйнага развіцця. Немагчыма выхаваць інжынера, узброіць метадалогіяй вучонага, пазбавіць маральнага старэння машыны, зрабіць эканамічны прагноз.

У Рэспубліцы Беларусь шмат увагі надаецца раскрыццю выхаваўчага патэнцыялу падзей і з'яў культурнага жыцця. Вялікім патрыятычным гучаннем напоўнены дзяржаўныя святы: Дзень

Перамогі, Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга, якія праходзяць з шырокім удзелам кіраўніцтва краіны. За гады найноўшай гісторыі суверэннай Рэспублікі Беларусь сучасныя рысы набылі такія традыцыйныя святы, як Дажынкі, Дзень беларускай пісьменнасці.

Дзяржаўны клопат аб развіцці культуры і мастацтваў відавочны ў такіх узорах айчыннай культуры, як Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Вялікі акадэмічны тэатр оперы і балета, Палацава-паркавы ансамбль у г. Нясвіжы, замкавы комплекс у г. п. Мір, Касаўскі і Ружанскі палацы, Дзяржаўны цырк, сядзібны дом у в. Чырвоны Бераг і іншых аб’ектах спадчыны. Здзейснена рэстаўрацыя Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы. Вядзецца рэстаўрацыя Тэатра юнага гледача, палаца ў в. Жылічы, замка ў г. Лідзе, рэштак замкаў у Гальшанах і Крэва. Рэалізуюцца Дзяржаўныя праграмы «Замкі Беларусі», адраджэння традыцыі ўзору дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Слуцкія паясы».

Культура кожнага народа ахоплівае як матэрыяльныя, так і духоўныя (нематэрыяльныя) праяўленні творчасці чалавека, якія ў комплексе ствараюць своеасаблівую сістэму этнічнай і нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Гэтая культурна-духоўная прастора арганізуецца з дапамогай не толькі пісьмовых паведамленняў, але і «мнеманічных сімвалаў», што ўтвараюць найбольш глыбінны пласт калектыўнай памяці. Да іх адносяцца прыродныя і створаныя чалавекам аб’екты, а таксама дзеянні (рытуалы, урачыстасці), звязаныя з імі. Таму адна з важнейшых задач вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у галіне нематэрыяльнай культуры – прадухіляць тыражыраванне ў сродках масавай інфармацыі непрафесійных і памылковых тлумачэнняў духоўнай спадчыны, скажэння міфалогіі, абрадаў, святаў і г. д. Сумесныя даследаванні будуць спрыяць эфектыўнаму супрацьдзеянню і пранікненню запазычаных, часта антыгуманістычных элементаў масавай культуры, іх разбуральнага ўздзеяння на культурную аўтэнтыку.

Цэнтрам даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры выдадзены рад новых навуковых прац, якія запаўняюць істотныя прабелы ў гісторыі мастацтваў, этналогіі, фалькларыстыцы, літаратуры і мовазнаўстве і маюць інавацыйнае значэнне. Выйшлі чарговыя тамы шматтомных серый «Беларусы», «Гарады і вёскі Беларусі». Падрыхтаваны і выдадзены «Усеагульная гісторыя мастацтваў» для школ з паглыбленым вывучэннем архітэктуры і мастацтва, вучэбны дапаможнік для ВНУ «Гісторыя беларускага мастацтва» ў двух тамах, а таксама буйныя працы – «Экран і культурная спадчына Беларусі», «Беларускае народнае мастацтва», «Хто жыве ў Беларусі», «Архітэктура Беларусі ў сусветным і еўрапейскім кантэксце», «Гістарычны слоўнік беларускай мовы», «Агульнаславянскі лінгвістычны атлас»; шматтомныя зборы твораў М. Танка, І. Шамякіна, І. Навуменкі.

Між тым выкарыстанне вынікаў фундаментальных даследаванняў беларускіх вучоных установамі Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі і іншых ведамстваў недастатковае. Пры актыўным удзеле Міністэрства культуры і навуковых устаноў сацыяльна-гуманітарнага профілю Міністэрства адукацыі павінны ажыццяўляцца распрацоўка і паслядоўнае ўдасканаленне метадалагічных асноў сістэмнай работы па змястоўным развіцці ідэалогіі беларускай дзяржавы з улікам узаемаўплыву розных сфер духоўнай культуры і грамадскага жыцця.

У 2009 годзе адбылося сумеснае пасяджэнне Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, па выніках якога была прынята праграма навуковага супрацоўніцтва на 2010–2015 гады. Праграма распрацавана ў адпаведнасці з Законамі Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь», «Аб кінематаграфіі ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь», рашэннямі IV Усебеларускага народнага сходу і Першага з’езда вучоных Рэспублікі Беларусь, іншымі праграмнымі дакументамі, якія рэгулююць пытанні культурнага, сацыяльнага, ідэалагічнага і грамадскага жыцця краіны.

Праграма канкрэтызуе сістэму прыярытэтаў, улічвае магчымасці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь па выкарыстанні навуковага і культурнага патэнцыялу ў якасці важнейшага фактару сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны,

а таксама як сродку эстэтычнага, маральна-патрыятычнага выхавання асобы. Яна накіравана на далейшае ўмацаванне партнёрскіх адносін паміж Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь. Праграма мае комплексны характар і будзе садзейнічаць інтэграцыі дзейнасці ў сферы культуры дзяржаўных органаў і навуковых устаноў. Яе рэалізацыя будзе ажыццяўляцца з мэтай захавання і развіцця нацыянальнай беларускай культуры як носьбіта гістарычнай ідэнтычнасці і асновы для пераемнага развіцця ў кантэксце сучасных этнакультурных працэсаў, удасканалення работы ў сферы народнай і прафесійнай творчасці.

### 1. Актуальныя праблемы развіцця нацыянальнай культуры

Сістэма мер, накіраваных на захаванне, развіццё і распаўсюджванне культуры, забеспячэнне магчымасці развіцця творчых здольнасцей і засваення ведаў, якія спрыяюць удасканаленню камунікатыўных магчымасцей і пашырэнню культурнага далягляду грамадзяніна, – аснова дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры.

Да ліку важнейшых прыярытэтаў адносяцца **папулярызацыя айчыннай інтэлектуальна-культурнай спадчыны**, рост іміджу Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне як важнага культурнага цэнтра Еўропы. Гэта будзе садзейнічаць паглыбленню сферы міждзяржаўнага супрацоўніцтва, павелічэнню інвестыцыйнай прывабнасці Беларусі для замежных партнёраў, асабліва ў галіне турызму, аховы агульнаеўрапейскай культурнай спадчыны, супрацоўніцтва з беларускімі навуковымі і культурнымі ўстановамі, калектывамі мастацкай творчасці.

Асобным напрамкам з’яўляецца **наладжванне ўзаемадзеяння з грамадскімі арганізацыямі** і грамадзянскімі ініцыятывамі на аснове скаардынаваных праграм супрацоўніцтва, сумесных мерапрыемстваў, рэалізацыя якіх будзе спрыяць умацаванню нацыянальнай бяспекі ў духоўна-маральнай сферы, грамадзянскага міру і згоды, пераадоленню негатыўных з’яў грамадскага жыцця, павышэнню ўстойлівасці грамадскай свядомасці да дэструктыўных уздзеянняў масавай культуры, штучных і некрытычна ўспрымаемых каштоўнасных запазычанняў.

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» доўгатэрміновымі мэтамі і задачамі дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры з’яўляюцца:

– забеспячэнне і абарона канстытуцыйнага права кожнага грамадзяніна на ўдзел у культурным жыцці;

– устанаўленне гарантый свабоды мастацкай творчасці і іншай творчай дзейнасці;

– садзейнічанне захаванню, развіццю і распаўсюджванню культуры на карысць інтарэсаў чалавека і грамадства;

– сацыяльная абарона работнікаў культуры і творчых работнікаў;

– абарона грамадскай маралі, сцвярджэнне гуманістычных ідэй і высокіх маральных пачаткаў у грамадскім жыцці, фарміраванне эстэтычнага жыццёвага асяроддзя;

– развіццё міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне культуры [7].

**Мова** – адна з галоўных этнічных прыкмет, духоўны набытак народа, аснова і найважнейшая частка яго культуры. Культурнае развіццё беларускай нацыі патрабуе актыўнай культурнамоўнай дзейнасці дзяржавы і грамадства. Галоўны з напрамкаў гэтай дзейнасці – захаванне і развіццё беларускай мовы як зыходнай формы нацыянальнай культуры ва ўсіх аспектах яе функцыянавання (у мастацтве, мастацкай адукацыі, побыце і г. д.) і асновы самасвядомасці беларускага народа.

Надзённай задачай з’яўляецца распаўсюджванне беларускай мовы ва ўсіх важнейшых сферах жыцця. Беларуская мова павінна стаць важнейшым атрыбутам культурнага жыцця ў рэспубліцы, аказваць уплыў на ўзаемаадносіны ў грамадстве, стаць на практыцы сімвалам нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, паспяхова выконваць усе важнейшыя грамадскія функцыі і вытрымліваць канкурэнцыю з іншымі мовамі.

Дзяржаўная культурная палітыка павінна прадугледжваць падтрымку, развіццё і пашырэнне валодання і карыстання іншымі мовамі, акрамя беларускай і рускай, знакавымі сістэмамі розных тыпаў, што абслугоўваюць зносіны нацыянальнай культуры ў міжнароднай сферы.

Асаблівасцю беларускай нацыянальнай культуры з'яўляецца яе **рэгіянальная разнастайнасць**, якая служыць крыніцай новых форм і асновай развіцця прафесійнага і народнага мастацтваў. На Беларусі вылучаецца шэсць асноўных культурных рэгіёнаў: Падняпроўе, Панямонне, Усходняе Палессе, Заходняе Палессе, Паазер'е і Цэнтральны рэгіён. Падтрымка рэгіянальных культур прадугледжвае наступныя напрамкі дзейнасці:

– захаванне рэгіянальных культурных традыцый;

– стварэнне аптымальнай інфраструктуры мясцовых культур з улікам спалучэння агульнанацыянальных і рэгіянальных тэндэнцый;

– этналагічнае даследаванне рэгіянальных культур на навуковым, навукова-асветніцкім і краязнаўчым узроўнях;

– развіццё і ўдасканаленне форм, спосабаў, шляхоў, сродкаў трансляцыі рэгіянальных культурных традыцый нашчадкам.

Культурная прастора Беларусі ўяўляе **сукупнасць культур разнастайных этнічных супольнасцей**: рускіх, палякаў, украінцаў, літоўцаў, латышоў, татар, яўрэяў і інш. Захоўваючы сваю нацыянальную адметнасць, усе яны ўваходзяць у агульнанацыянальную культурную прастору беларускай дзяржавы.

Дзяржаўная палітыка ў сферы культуры ахоўвае гістарычна сфарміраванае суіснаванне і ўзаемадзеянне культур нацыянальных супольнасцей з культурай беларусаў, гарантуе свабоднае развіццё нацыянальных і этнічных груп насельніцтва краіны і клапоціцца аб іх свабоднай культурнай арыентацыі і інтэграцыі ў агульнанацыянальную культурную прастору.

Дзяржаўная палітыка ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны грунтуецца на прынцыпах прызнання яе фактарам развіцця дзяржавы.

Асноўнымі задачамі Праграмы супрацоўніцтва НАН Беларусі і Міністэрства культуры ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны з'яўляюцца:

– унясенне прапаноў у дзеючыя нарматыўныя прававыя акты з мэтай забеспячэння вырашэння дзяржаўных задач і ажыццяўлення дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны;

– удасканаленне абгрунтаванняў навукова-праектных рашэнняў для рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях;

– удасканаленне навуковага кіраўніцтва ў ходзе работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях;

– падрыхтоўка экспертных заключэнняў па аб'ектах матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны, прапанаваных для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Аўтэнтычныя формы традыцыйнай культуры патрабуюць спецыяльнай увагі і спецыфічных падыходаў. У першую чаргу гэта тычыцца жывых форм, якія найбольш востра адчуваюць дэструктыўнае ўздзеянне глабалізацыі, масавай культуры, урбанізацыі. **Захаванне жывых традыцый** немагчыма без мэтанакіраванай і доўгатэрміновай навуковай падтрымкі. Такая падтрымка заключаецца ў сістэме метадаў, накіраваных на стварэнне:

– нарматыўнай прававой базы для вызначэння прававых, сацыяльна-эканамічных і арганізацыйных норм у галіне аховы і захавання аўтэнтычных форм нематэрыяльнай культурнай традыцыі;

– умоў для навуковай рэстаўрацыі аўтэнтычных традыцый і натуральнага асяроддзя іх існавання.

Неабходна каардынацыя паміж навуковымі ўстановамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, установамі культуры і адукацыі. Такая работа прадугледжвае вырашэнне наступных праблем:

– арганізацыі і каардынацыі навуковых даследаванняў у галіне традыцыйнай культуры;

– метадычнага забеспячэння дзейнасці ўстаноў культуры: дамоў (цэнтраў) рамёстваў, фальклору, народнай творчасці і інш.

Матэрыяльныя формы традыцыйнай народнай культуры беларусаў прадстаўлены галіной народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, рамёствамі і мастацкімі промысламі.

Падтрымцы і захаванню культурнай спадчыны садзейнічаюць Закон Рэспублікі Беларусь «Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь», Палажэнне аб народным майстры і іншыя заканадаўчыя акты [8].

Прыярытэтнымі праблемамі павінны стаць узмацненне і **даследаванне ролі прафесійнага мастацтва** ў эстэтычным і маральным выхаванні, пераход да актыўнага развіцця ўсіх яго відаў, павышэнне прэстыжу работнікаў творчых прафесій, радыкальнае паляпшэнне матэрыяльнай базы, умоў і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

## 2. Фундаментальныя даследаванні – інавацыйнаму развіццю культуры

Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры – буйнейшая навуковая ўстанова ў Аддзяленні гуманітарных навук і мастацтваў (196 супрацоўнікаў, 27 дактароў навук, у тым ліку 1 акадэмік, 6 членаў-карэспандэнтаў, 86 кандыдатаў навук) складаецца з двух філіялаў: «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы» і «Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы». Цэнтр валодае ўнікальнай базай крыніц для даследавання пытанняў мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі, мовы і літаратуры. Калекцыі помнікаў старажытнабеларускага мастацтва і фальклорныя запісы ўключаны ў Дзяржаўны рэестр навуковых аб’ектаў, якія складаюць нацыянальны здабытак.

**Вырашэнне дзяржаўных задач патрыятычнага выхавання і сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускага грамадства.** Навукоўцы Цэнтра канцэнтруюць увагу на комплексным вывучэнні самабытнасці беларускага мастацтва, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, мовы і літаратуры. Праводзяцца навуковыя даследаванні ў галіне мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі, мовы і літаратуры, якія забяспечваюць навуковае суправаджэнне дзяржаўных рашэнняў у сферы нацыянальнай палітыкі, захавання традыцыйнай і развіцця сучаснай культуры беларусаў і этнічных груп, умацавання этнакультурных кантактаў з народамі свету, выхавання пачуцця патрыятызму, любові да сваёй Радзімы і народа.

Выкананы цэлы рад праектаў, якія маюць важнае сацыяльна-эканамічнае значэнне: «Народная архітэктура Беларусі: традыцыі і роля ў развіцці сельскіх ландшафтаў і адраджэнні сяла», «Традыцыі і інавацыі ў сучаснай архітэктуры і дызайне». Створаны падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, слоўнікі і даведнікі, што шырока выкарыстоўваюцца ў паўсядзённай практыцы: «Слоўнік беларускай мовы», «Арфаграфічны слоўнік», «Беларуска-рускі слоўнік. ТТ. 1–3», «Руска-беларускі слоўнік. ТТ. 1–3».

**Ахова гісторыка-культурнай спадчыны, развіццё турызму.** Напрацаваныя больш чым за паўстагоддзя вынікі даследаванняў маюць вялікае значэнне для справы захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей, як матэрыяльных, так і нематэрыяльных. Фундаментальнае выданне «Беларуская народная творчасць», якое налічвае больш за 40 тамоў, з’яўляецца ўнікальнай анталогіяй беларускай фалькларыстыкі, змяшчае ўсё багацце і разнастайнасць беларускай духоўнай культуры: песні, балады, паданні і г. д. Гэтая навуковая база пакладзена ў аснову ўсіх айчынных праграм навучання ў галіне фалькларыстыкі, праграм курсаў і спецкурсаў навучальных устаноў і адыгрывае істотную ролю ў вырашэнні праблем аховы фальклору, надання помнікам нематэрыяльнай духоўнай спадчыны статусу нацыянальнай каштоўнасці. Працягам стала шматтомнае выданне «Беларускі фальклор: віды, жанры, паэтыка» з шасці тамоў, энцыклапедыя «Беларускі фальклор» у двух тамах.

Дзякуючы шматгадовай працы Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы створаны «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», што мае непасрэднае дачыненне да праблемы аховы помнікаў архітэктуры, манументальнага мастацтва, горадабудаўніцтва і сядзібна-паркавага дойлідства. Восем тамоў гэтага выдання з’яўляюцца, па сутнасці, дзяржаўным спісам помнікаў, падставай, якая дазваляе надаваць ім ахоўны статус. У Зводзе змешчаны звесткі і атрыбуцыя па больш як 16 тысячам археалагічных, гістарычных, архітэктурных, манументальных і іншых помнікаў нашай краіны. Выданні, падрыхтаваныя інстытутам, маюць міжнароднае прызнанне: напрыклад, «Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва

ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце» з шасці кніг узнагароджана дыпломам на Маскоўскім кніжным кірмашы, прысвечаным 20-годдзю СНД.

Выйшла 10 кніг выдання «Гарады і вёскі Беларусі». Плануецца падрыхтаваць 16 тамоў, дзе будзе ахоплена больш за 24 тысячы хутароў, вёсак, мястэчак, малых і буйных гарадоў: выкладзена іх гісторыя на падставе найноўшых гісторыка-бібліяграфічных даследаванняў, новых матэрыялаў, здабытых у экспедыцыях, выяўленых у архівах. Гэтая праца мае вялікае значэнне не толькі для навучальнага працэсу, але і для органаў дзяржаўнага кіравання.

Як адзначалася, дзяржава праяўляе вялікі клопат і аказвае значную фінансавую падтрымку ў галіне рэстаўрацыі і аховы помнікаў, ідзе рэгенерацыя гістарычных цэнтраў Гродна, Пінска, іншых гарадоў, ёсць асобныя праграмы па аднаўленні помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва. У выніку працы вызначылася вялікая колькасць праблем, памылак, спрэчных і недакладных рашэнняў. Усё гэта непакоіць і спецыялістаў, і грамадскасць нашай краіны. Не толькі з пункту гледжання таго, што многія аб’екты гістарычнай спадчыны Беларусі павінны быць уключаны ў Спіс сусветнай і культурнай спадчыны ЮНЕСКА, але і таму, што гэтую спадчыну неабходна аднаўляць і рэстаўрыраваць якасна, па апошняму слову навукі.

Сёння Інстытут актыўна ўдзельнічае ў рабоце над дапаўненнямі і змяненнямі ў Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны». У выніку супрацоўніцтва з адпаведнымі міністэрскімі ўпраўленнямі ўпершыню ўнесены тры прынцыповыя змены ў закон. Пры выкананні работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях катэгорыі 0, 1 і 2 кіраўнікі праектаў прызначаюцца Міністэрствам культуры па прадстаўленні заказчыка на падставе заключэння Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і ўзгаднення Навукова-метадычнай рады. Такая папраўка дае рэальную магчымасць акадэмічнай навуцы аказваць істотны ўплыў на якасную арганізацыю гэтай работы.

Пастаянна вядзецца работа па пошуку, навуковай атрыбуцыі і перакладу на сучасную беларускую мову помнікаў старажытнабеларускай літаратуры, у тым ліку і тых, якія захоўваюцца за межамі нашай краіны.

У рамках рэалізацыі інавацыйных праектаў з Міністэрствам спорту і турызму выйшаў рад прац, накіраваных на навуковае забеспячэнне турызму ў Беларусі. Гэта калектыўная манаграфія «Турыстычная мазаіка Беларусі» (на рускай і англійскай мовах), манаграфіі «Гісторыка-культурныя ландшафты Беларусі», «Падарожжа па Беларусі: гарады і гарадскія пасёлкі», серыі артыкулаў у перыёдыцы. У апошнія гады распрацаваны праекты «Духоўныя традыцыі ў народным жыллі як фактар развіцця экатурызму», «Беларуска-румынскі турызм: перспектывы развіцця ў кантэксце транс’еўрапейскіх турыстычных калідораў». Пачалася праца над праектам электроннага атласа гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, Збору рухомых помнікаў гісторыі і культуры. У бягучым годзе выходзіць у свет першы том шматтомнай серыі «Нарысы гісторыі культуры Беларусі», прысвечаны культуры сацыяльнай эліты.

**Рэпрэзентацыя культурнай спадчыны рэгіёнаў.** Распрацавана навуковае абгрунтаванне для надання народна-традыцыйнаму абраду «Шчодрык» з в. Рог Салігорскага раёна Мінскай вобласці статусу помніка нематэрыяльнай культурнай спадчыны, навуковае суправаджэнне абрадаў «Конікі» г. п. Давід-Гарадок Столінскага раёна Брэсцкай вобласці, «Будслаўскі фэст» Мядзельскага раёна Мінскай вобласці для ўключэння іх у спіс помнікаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Аддзел музычнага мастацтва і этнамузыкалогіі прымаў удзел у падрыхтоўцы дакументацыі па абраду «Тураўскі карагод», якому нададзены статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Супрацоўнікі аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў гатовы аказаць неабходную навукова-метадычную і арганізацыйную дапамогу па ўключэнні ў Спіс нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў якасці помнікаў абрадаў «Ваджэнне куста» (Пінскі раён), «Провады русалкі» (Лоеўскі раён) і інш.

Вядзецца сумесная праца над буйнымі рэгіянальнымі праектамі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў». Па выніках даследавання з друку выйшлі кнігі: «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т.: Магілёўскае Падняпроўе; Віцебскае Падзвінне; Гродзенскае Панямонне (у 2 кн.); Брэсцкае Палессе (у 2 кн.), Гомельскае Палессе (у 2 кн.)».

Супрацоўнікі аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў праводзяць збор і сістэматызацыю фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў у рэгіёнах, падрыхтоўку народных свят,

фестываляў і конкурсаў мастацкай самадзейнасці. Прыкладам такога супрацоўніцтва можа стаць навукова-метадычнае суправаджэнне штогадовага міжнароднага фестывалю народнай творчасці «Фальклор без межаў» у Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці.

**Даследаванне праблем нацыянальнай мовы і літаратуры, паходжання беларускага народа і сучасных этнічных працэсаў.** У апублікаваных выпусках «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы» ўпершыню лексікаграфічную апрацоўку атрымалі каля 4000 новых лексічных адзінак. «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» – першы і адзіны ў айчыннай гуманітарыстыцы даведнік, які з максімальнай паўнатой адлюстроўвае багацце слоўнікавага фонду беларускай мовы ў перыяд XIV–XVIII стст., з'яўляецца надзейнай крыніцай пазнання мінулага Беларусі, дае багатую інфармацыю пра сацыяльна-эканамічнае жыццё, матэрыяльную і духоўную культуру беларускага народа. Слоўнік спрыяе захаванню, перадачы і папулярызацыі інтэлектуальнай спадчыны беларусаў. Яго выданне ўмацоўвае статус беларускай гуманітарнай навукі на міжнародным узроўні. Супрацоўнікі Цэнтра прымалі актыўны ўдзел у распрацоўцы доўгачасовага праекта «Агульнаславянскі лінгвістычны атлас». Гэта найбуйнейшы праект у гісторыі сусветнай лінгвагеаграфіі, над якім працуюць мовазнаўцы 12 славянскіх краін і Германіі.

У адпаведнасці з распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб ўвекавечванні памяці народнага пісьменніка Беларусі Шамякіна Івана Пятровіча» праведзена навукова-тэксталагічнае даследаванне тэксту чарговых тамоў (16-га, 17-га і 18-га), куды ўключаны раманы 1979–1987 гг. Падрыхтаваныя тамы будуць запатрабаваны даследчыкамі пры далейшым, больш паглыбленым вывучэнні творчасці І. Шамякіна, а таксама актуальных праблем літаратуразнаўства, лінгвістыкі, многіх гістарычных падзей, маральных праблем. Творы І. Шамякіна будуць задзейнічаны ў сферы адукацыі, культуры, выдавецкай дзейнасці. Завершана выданне творчай спадчыны класікаў беларускай літаратуры Якуба Коласа (у 20 тамах), Максіма Танка (у 13 тамах), выдаецца збор твораў народнага пісьменніка Беларусі Івана Навуменкі (у 10 тамах), распрацоўваецца 50-томная серыя «Залатая калекцыя беларускай літаратуры» (выйшлі першыя 4 тамы), пачалося выданне цыкла «Помнікі старажытнай пісьменнасці Беларусі». Гэтыя і іншыя кніжныя выданні карыстаюцца вялікім попытам у сучаснага чытача.

Выніковай працай, у якой дадзена аб'ектыўная новая канцэпцыя этнагенезу і этнічнай гісторыі беларускага народа, яго матэрыяльнай і духоўнай культуры, з'яўляецца трынаццацітомнае выданне «Беларусы», якому няма аналагаў у СНД і Еўропе. У 2009 годзе яно было ўдастоена прэміі «За духоўнае адраджэнне». У манаграфіі «Беларусы. Сучасныя этнакультурныя працэсы» ўпершыню ў беларускай этналогіі на падставе матэрыялаў шматгадовых палявых экспедыцыйных даследаванняў, статыстычных і архіўных крыніц аналізуюцца асноўныя фактары этнакультурнай дынамікі. Раскрываецца роля дзяржавы ў фарміраванні сучасных этнакультурных працэсаў, апісваюцца сучасныя святы, традыцыі сямейнага выхавання і этнакультурныя змены ў сям'і, прафесійная культура і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

У кнізе «Этнокультурные процессы Восточного Полесья в прошлом и настоящем» раскрыты важнейшыя аспекты культуры рэгіёна: матэрыяльнай (традыцыйная ежа, асаблівасці народнага дойлідства, касцюма), сацыяльнай (сямейныя і грамадскія адносіны), духоўнай (канфесіянальныя працэсы, святы, абрады, звычаі, сучасны тэатр), этнічнай гісторыі, дэмаграфічных і міграцыйных працэсаў Усходняга Палесся. Здабытыя матэрыялы палявых этнаграфічных даследаванняў і архіўныя крыніцы ўводзяцца ў навуковы ўжытак упершыню.

У калектыўнай манаграфіі «Кто живет в Беларуси» раскрыта сацыяльная (дэмаграфія, сямейныя адносіны, грамадскія аб'яднанні), матэрыяльная (жыллё, традыцыйная ежа, касцюм) і духоўная (вераванні, абрады, фальклор, рэлігійныя традыцыі) культура народаў, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі, разгледжана гісторыя канфесій і сучасная рэлігійная сітуацыя ў краіне.

Манаграфіі «Мужчынскі касцюм Беларусі» і «Жаночы касцюм Беларусі» выклікалі вялікую цікавасць, у тым ліку з боку мастакоў, мадэльераў, сцэнографаў і былі ўдастоены прэміі Нацыянальнай акадэміі навук.

**Папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны і распрацоўка праектаў у сферы музеефікацыі.** Вынікі фундаментальных даследаванняў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі атрымалі практычнае ўкараненне ў стварэнні

навуковага праекта музеефікацыі другога пускавога комплексу палаца ансамбля Радзівілаў у Нясвіжы. Праведзена комплекснае даследаванне помнікаў народнага дойлідства для Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту.

Зроблены метадычныя распрацоўкі па рэканструкцыі беларускага традыцыйнага касцюма для выкарыстання УП «Скарбніца» канцэрна «Белмастацпромыслы». На аснове еўрапейскага вопыту захавання гісторыка-культурных ландшафтаў распрацавана канцэпцыя Нацыянальнага парка «Нарачанскі».

У справе папулярызацыі архітэктурнай спадчыны Беларусі важнае месца займаюць новыя шматтомныя працы «Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце», «Праваслаўныя храмы Беларусі», «Каталіцкія храмы Беларусі», манаграфія «Беларусь у малюнках Напалеона Орды» і інш.

Пашыраецца праца з рэгіёнамі па папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны, аказанні неабходнай метадычнай дапамогі ўстановам культуры на месцах. Распрацавана навуковая канцэпцыя Астравецкага гісторыка-этнаграфічнага музея. Арганізуюцца святы рамёстваў, семінары-практыкумы, майстар-класы ў рэгіёнах рэспублікі.

Матэрыялы, сабраныя этнамузыколагамі ў выніку шматгадовых экспедыцый, уключаны ў рэпертуарныя канцэртныя праграмы Беларускага дзяржаўнага народнага хору, Нацыянальнай харавой капэлы, ансамбля «Харошкі», рэгіянальных прафесійных і фальклорных калектываў. Даследаванні Цэнтра знайшлі прымяненне ў развіцці культурна-асветніцкай сферы рэгіёнаў. Народна-традыцыйная культура пастаянна папулярызуецца на штогадовых Днях беларускага пісьменства.

Праведзены цыкл заняткаў з удзельнікамі Рэспубліканскага навукова-практычнага семінара «Культурная спадчына як духоўная каштоўнасць у выхаванні і развіцці дзяцей і моладзі» («Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі», кіраўнікі калектываў дэкаратыўна-прыкладной творчасці і спецыялісты ўстаноў пазашкольнага выхавання і навучання), для канцэрна «Белмастацпромыслы» пры Упраўленні справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь праведзены Рэспубліканскі семінар для работнікаў аддзелаў культуры і музеяў, семінар-практыкум у г. Магілёве для работнікаў дамоў рамёстваў і музеяў.

У рамках выканання плана мерапрыемстваў дагавора аб супрацоўніцтве паміж НАН Беларусі і Міністэрствам культуры супрацоўнікі Цэнтра выступілі арганізатарамі і ўдзельнікамі рада акцый: 3-га Рэспубліканскага фестывалю-кірмашу рамёстваў «Вясновы букет», 2-га Рэспубліканскага свята-конкурсу выцінанкі «Чароўныя нажніцы», 4-га абласнога свята-конкурсу «Разьбы зачараванне» ў г. Мядзелі, 3-га абласнога свята-конкурсу паясоў і выцінанкі «Умельцы» ў г. Узда, 9-га абласнога свята-конкурсу драўлянай скульптуры «Сонечная цеплыня дрэва» ў г. Барысаве, 8-га Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур і інш.

Актыўная работа ажыццяўляецца на базе створанай у Цэнтры музейнай калекцыі. Штогод музей наведваюць каля 5 тыс. чалавек, на яго базе працуе вучэбна-метадычны цэнтр, праходзяць практыку студэнты ВНУ. Музей шырока прадстаўляе мастацтва Беларусі на выстаўках за мяжой. Калекцыі музея пастаянна выкарыстоўваюцца ў праграмах тэлебачання. На аснове калекцыі фальклорных запісаў рыхтуюцца розныя тэле- і радыёперадачы, праходзяць навучанне студэнты, працуюць спецыялісты культурна-асветніцкай сферы. Беларускім відэацэнтрам на аснове фальклорна-этнаграфічных сцэнарыяў знята серыя з 10 відэафільмаў: «Дажынкі», «Масленіца», «Купалле», «Вялікдзень», «Мой родны кут» і іншыя.

Супрацоўнікі Цэнтра рэгулярна выступаюць на радыё і тэлебачанні, у перыядычным друку (каля 200 выступленняў штогод), уваходзяць у склад педкалегій і выдавецкіх саветаў навуковых і навукова-папулярных часопісаў, чытаюць адкрытыя лекцыі, удзельнічаюць у стварэнні фільмаў і навукова-папулярных тэлепраграм.

**Фарміраванне пазітыўнага іміджу краіны.** Укладам у фарміраванне пазітыўнага іміджу Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца міжнародныя канферэнцыі пад эгідай ЮНЕСКА: «200-годдзе з дня нараджэння Напалеона Орды», «Сусветная фальклорная спадчына: мінулае, сучаснасць, перспектыўныя напрамкі даследаванняў», «Умацаванне нацыянальнага патэнцыялу па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны».

Праведзена кансультацыйная сустрэча і трэнінг ЮНЕСКА для экспертаў краін СНД «Умацаванне нацыянальнага патэнцыялу па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны».

На заключнай сесіі Рэгіянальнай сустрэчы прыняты распрацаваныя ў рамках выканання задання Рэкамендацыі па ўмацаванні нацыянальнага патэнцыялу па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны для краін кластара Бюро ЮНЕСКА ў Маскве. Праведзены XV Міжнародны з'езд славістаў. У гэтых форумах прымалі ўдзел прадстаўнікі вядучых даследчых школ Еўропы, Паўночнай Амерыкі, Азіі, Аўстраліі. Навукоўцы Цэнтра прадстаўлены ў Еўрапейскім савеце па культуры, Міжнароднай арганізацыі народнай творчасці (ЮНЕСКА), Міжнародным камітэце славістаў. Толькі за 2012 год Цэнтрам арганізавана і праведзена 11 выставак, дзе прадстаўлена 350 экспанатаў, у тым ліку ў дыпламатычных прадстаўніцтвах Беларусі ў Вялікабрытаніі (Лондан) і Францыі (Парыж).

**Сфера адукацыі.** Цэнтр з'яўляецца вядучай установай па падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі (кандыдатаў і дактароў навук) па раду гуманітарных спецыяльнасцей. У Цэнтры працуюць 4 доктарскія Саветы (этналогія і фалькларыстыка, мастацтвазнаўства, мовазнаўства, літаратура).

Вучоныя Цэнтра чытаюць у ВНУ звыш 30 курсаў лекцый па 10 спецыяльнасцях, кіруюць даследаваннямі магістрантаў і аспірантаў. Сумесна з БДУ створаны філіялы кафедр этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, беларускай мовы; сумесна з Беларускай акадэміяй мастацтваў – цэнтр вучэбнай практыкі студэнтаў творчых спецыяльнасцей пры Музеі старажытнабеларускай культуры. Дзякуючы працы вучоных Цэнтра ў ВНУ забяспечана выкладанне новых курсаў па развіцці турызму, айчыннага кіно, этнамузыкалогіі і музеязнаўству.

**Распрацоўка нарматыўных і рэгламентуючых дакументаў.** Пры актыўным удзеле супрацоўнікаў Цэнтра быў падрыхтаваны праект Дзяржаўнай праграмы адраджэння вытворчасці слуцкіх паясоў і стварэння нацыянальных брэндаў сувенірнай прадукцыі. Гэта стала формай рэалізацыі пункта 1.7.7. пратакола даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 жніўня 2012 г. і яшчэ адным крокам на шляху адраджэння культуры беларускага народа, яе шырокай прапаганды як унутры краіны, так і за яе межамі.

Мовазнаўцы Цэнтра распрацавалі «Закон аб мовах Рэспублікі Беларусь» і «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». Вынікі навуковых даследаванняў выкарыстаны пры распрацоўцы нарматыўных дакументаў у рамках Дзяржаўнай фундаментальнай праграмы «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь (2006–2010 гг.)»; Праграмы «Прыярытэтныя напрамкі развіцця тэатральнай справы ў Рэспубліцы Беларусь (2001–2010 гг.)» Міністэрства культуры Беларусі. Комплекснае даследаванне сучаснага сцэнічнага мастацтва Беларусі дазволіла стварыць канцэпцыю развіцця беларускага тэатральнага мастацтва, накіраваную на захаванне рэалістычных традыцый і нацыянальнай самабытнасці; сфармуляваць прыярытэтныя напрамкі сучаснага выяўленчага і сцэнічнага мастацтва па захаванні традыцыйных культурных і маральных каштоўнасцей беларускага народа.

Распрацавана нарматыўна-прававая база стандартызацыі нацыянальнай тапаніміі: падрыхтаваны тэхнічныя кодэксы сфарміраванай практыкі па перакладу тапаніміі сумежных з Беларуссю дзяржаў на беларускую мову, створаны комплекс прац «Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь», зацверджаны ў якасці нарматыўнага выдання, прызначанага для выкарыстання рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, юрыдычнымі і фізічнымі асобамі Рэспублікі Беларусь.

## 3. Інавацыйныя даследаванні і нявырашаныя праблемы захавання культурнай спадчыны

Па гранту БРФФД былі прааналізаваны кампазіцыйныя асаблівасці паркавага комплексу «Альба» ў Нясвіжы.

**У рамках праекта па заказу Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва** «Падрыхтаваць да выдання і выдаць «Дапаможнік праекціроўшчыку. Укараненне нацыянальных і рэгіянальных традыцый планіровачнай арганізацыі, кампазіцыі, мастацкай выразнасці ў архітэктуру і горадабудаўніцтва Беларусі» заснавана серыя навукова-метадычнага суправаджэння «Дапаможнік архітэктару» і выдадзена манаграфія «Архітэктурная спадчына Беларусі. Развіццё традыцый, ахова і рэстаўрацыя» (Мн., 2005), дзе абагульнены вопыт айчыннай рэстаўрацыі і распрацаваны рэкамендацыі па рэгенерацыі гістарычнай забудовы вёсак, мястэчак і гарадоў.

**Пры падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў** праведзены аналіз прыродна-каштоўных тэрыторый і гісторыка-культурных ландшафтаў Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (Мн., 2005) – першае абагульненае даследаванне айчыннай скансэналогіі.

**Па заказу УП «Мінскграда» ў рамках карэкціроўкі Генеральнага плана г. Мінска** выкананы раздзел «Гісторыка-культурная спадчына горада: гісторыка-бібліяграфічныя даследаванні; гісторыка-горадабудаўнічы апорны план» (2006–2007 гг.). У выніку значна пашыраны межы горадабудаўніча-каштоўных тэрыторый, якія ўключаюць забудову 40–60-х гг. мінулага стагоддзя. Рад раёнаў, іх забудова ўключаны ў дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.

**Па заказу УП «Мінскпраект»** выканана распрацоўка навуковага праекта «Канцэпцыя экспазіцыйных кампанентаў сядзібы і жылля Мінска XII–XVI стст.», «Старадаўні вадзяны млын», «Традыцыйная культура і побыт гараджан» да праекта «Мінскае замчышча. Нацыянальны гісторыка-археалагічны цэнтр» (2009–2010 гг.). Ажыццёўлена рэканструкцыя гістарычнага жылога і гаспадарчага асяроддзя. Праект адзначаны на маладзёжным інавацыйным форуме 2010 г.

**У ходзе распрацоўкі праекта ахоўных зон Белдзяржмузея народнай архітэктуры і побыту** інстытутам «Мінскграда», навукоўцамі Цэнтра была выканана гісторыка-архіўная і натурна-даследчая работа па паселішчах і тэрыторыях, якія ўваходзяць у рэжым ахоўных зон (2011 г.).

**У рамках інавацыйнага праекта** «Распрацаваць навукова-метадычныя рэкамендацыі і стварыць практычныя дапаможнікі для ўдасканалення працэсу засваення беларускай музычнай творчасці (народнай і прафесійнай) у сферы культуры і мастацтва Рэспублікі Беларусь» сфарміраваны фона- і нотахрэстаматыі па беларускай музыцы і распрацаваны рэкамендацыі для ўстаноў культуры рэспубліканскага, абласнога, гарадскога і раённага падпарадкавання, Белтэлерадыёкампаніі, спецыяльных навучальных устаноў, дзіцячых музычных школ, школ і студый з эстэтычным ухілам.

Вынікі праекта ўключаны ў аўтарскія курсы лекцый адукацыйных устаноў мастацтваў, увайшлі ў манаграфіі па мастацтву і культуры Беларусі, выдадзеныя ў 2007–2010 гг. («Музыка ў драматычным тэатры Беларусі», «Беларусы. Т. 11: Музыка», «Сучасныя беларускія кампазітары» і інш.). У выдавецтве «Вышэйшая школа» ў 2011 г. выйшла фонахрэстаматыя «Беларуская народная песня» (8 электронных дыскаў).

У 2012 годзе **заключаны дагавор з фірмай «Трайпл»** на распрацоўку навуковага праекта музейнай экспазіцыі культурна-этнаграфічнага комплексу «Наш роды кут Сабалі». У выніку натурных даследаванняў у Брэсцкай вобласці выяўлены аўтэнтычныя пабудовы народнага дойлідства, сабраны звесткі пра народных майстроў, носьбітаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, распрацаваны праект лакальнага музея пад адкрытым небам. У бягучым годзе працягваецца работа па падрыхтоўцы тэматыка-экспазіцыйных планаў.

**Для Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь** распрацавана навуковае абгрунтаванне серыі памятных манет «Народныя промыслы і рамёствы Беларусі».

**Для Міністэрства па надзвычайных сітуацыях** сабраны, сістэматызаваны і зафіксаваны на электронных носьбітах матэрыялы, што раскрываюць гісторыка-культурны патэнцыял 21 раёна Брэсцкай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС [9].

Сёння ў сферы аховы і рэстаўрацыі гісторыка-культурнай спадчыны застаецца шэраг праблем, у вырашэнні якіх патрабуецца ўдзел акадэмічнай навукі.

Па-ранейшаму працэс разбурэння помнікаў гісторыі і культуры апярэджвае тэмпы іх рэвіталізацыі – спадчына, што засталася ад савецкіх часоў.

Праблемай застаюцца канфліктныя суадносіны зон гістарычнай забудовы гарадоў і новабудоўляў. Гарады і мястэчкі Беларусі, як і іншых краін Еўропы, гістарычныя, іх забудова ўяўляе сабой жывую тканіну, якая часам фарміравалася стагоддзямі. Яна вызначае рэгіянальнае і нацыянальнае аблічча населеных пунктаў. У вырашэнні гэтай праблемы трэба запоўніць прабелы як у тэорыі, так і ў метадалогіі рэстаўрацыі. Неабходна ўлічваць не толькі суверэнітэт помніка ці гісторыка-архітэктурнага ансамбля, але і нематэрыяльныя каштоўнасці асяроддзя, спецыфіку традыцый, атрактыўнасць прыродных і архітэктурных дамінант, адным словам, увесь тэкст у гістарычнай і асяродкавай прасторы.

Улічваючы незаменныя страты, перажытыя гісторыка-культурнай спадчынай краіны па розных прычынах і ў розныя эпохі, варта імкнуцца да максімальнага захавання аўтэнтычнага матэрыялу, у радзе работ на ўнікальных аб'ектах абмяжоўвацца кансервацыяй, дакладна размяжоўваць рэстаўрацыю і аднаўленне. Навуковая рэстаўрацыя – доўгі і карпатлівы працэс. Яе вынікі важныя не толькі для нас, але яшчэ больш для наступных пакаленняў.

У краіне налічваецца ў рознай ступені захаванасці каля тысячы аб'ектаў сядзібна-паркавай архітэктуры. У Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей іх амаль паўтары тысячы. Асабліва хутка разбураюцца паркі, ператвараючыся ў запушчаны лес. Аднаўленне іх першапачатковага аблічча патрабуе глыбокага навуковага суправаджэння.

Беларусь, як і ўсе славянскія краіны, кажучы словамі вядомага мастацтвазнаўцы, мастака і рэстаўратара І. Э. Грабара, – краіна дойлідаў. Маецца на ўвазе спадчына яе народнай архітэктуры, тое, што захавалася ў гістарычных вёсках, мястэчках, прадмесцях гарадоў. Народнае дойлідства і цяпер ідзе разам з жыццём, больш за тое, актуальнымі з'яўляюцца яго планіровачныя канструкцыйныя рашэнні, матэрыялы, эканамічныя, энергазберагальныя, якія захоўваюць прыродную натуральнасць і цеплыню.

Але трывожыць шырокае распаўсюджванне псеўданародных, эклектычных збудаванняў, сядзіб, рэканструкцый «пад народную архітэктуру» з ацыліндраванай драўніны, мадыфікаванага брусу з чужымі для наяўнага асяроддзя формамі, прапорцыямі, колерам. Відавочная вульгарызацыя традыцый, мастацтва народных дойлідаў, што адмоўна адбіваецца на ўспрыманні народна-традыцыйнай культуры, даверы да яе аўтэнтыкі.

Даследаванні аддзела старажытнабеларускай культуры і вынікі выкананых пры падтрымцы БРФФД праектаў робяць цалкам рэальнай падрыхтоўку Збору рухомых помнікаў гісторыі і культуры.

Фундаментальныя і прыкладныя даследаванні акадэмічных вучоных па-ранейшаму складаюць навуковую аснову ў фарміраванні дзяржаўнай палітыкі ў галіне захавання гісторыка-культурнай спадчыны і нацыянальнага аблічча дзяржавы ў кантэксце сусветнай культурнай разнастайнасці.

У бліжэйшай перспектыве патрабуецца канцэнтрацыя намаганняў на рэалізацыю такога важнага напрамку навуковых даследаванняў, як «Гісторыка-культурная спадчына Беларусі і яе эфектыўнае практычнае выкарыстанне для развіцця і ўмацавання беларускай дзяржаўнасці». Дадзеная распрацоўка будзе спрыяць не толькі вырашэнню актуальных навуковых задач, але і ўмацаванню прэстыжу краіны на міжнародным узроўні, яе турыстычнага патэнцыялу, патрыятычнаму і духоўнаму выхаванню моладзі, папулярызацыі ведаў па гісторыі і культуры краіны.

## 4. Глабалізацыя і задачы міжнароднай супольнасці ў галіне аховы культурнай разнастайнасці

На фоне 60-гадовага будаўніцтва Еўрапейскага саюза паўстала пытанне аб захаванні моўнай і культурнай разнастайнасці. І гэта падаецца сімптаматычным, калі ўспомніць Канвенцыі ЮНЕСКА, прынятыя пасля Другой сусветнай вайны.

У Канвенцыі «Аб ахове культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту» (1954 г.) адзначаецца, што «бакі абавязаны паважаць культурныя каштоўнасці, размешчаныя на іх асабістай тэрыторыі, а таксама на тэрыторыі іншых (дзяржаў. – *А. Л.*)» [1, арт. 4].

Канвенцыя «Аб мерах, накіраваных на забарону і папярэджанне незаконнага вывазу, увозу і перадачы правоў уласнасці на культурныя каштоўнасці» (1970 г.) абвяшчае, што «абмен культурнымі каштоўнасцямі паміж краінамі ў мэтах адукацыі, навукі і культуры пашырае веды пра чалавечую цывілізацыю, узбагачае культурнае жыццё ўсіх народаў і выклікае ўзаемную павагу і разуменне паміж краінамі» [2].

У афіцыйным дакуменце ЮНЕСКА «Аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны» (1972 г.) дэкларуецца, што дзяржавы павінны «праводзіць агульную палітыку, накіраваную на наданне культурнай і прыроднай спадчыне пэўных функцый у грамадскім жыцці; развіваць навуковыя і тэхнічныя распрацоўкі і ўдасканальваць метады работы, якія дазваляюць дзяржаве пазбягаць небяспекі, што пагражае яе культурнай і прыроднай спадчыне» [3, арт. 5].

Прынятая ў 2003 г. Канвенцыя «Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны» мае на мэце не абарону, а менавіта ахову, паколькі «абарона мае на ўвазе стварэнне бар'ераў вакол той ці іншай формы выражэння, яе ізаляванасць ад яе кантэксту і мінулага і паніжэнне яе сацыяльнай функцыі або каштоўнасці. Ахова звязана з захаваннем яе жывога характару, каштоўнасці і функцыі» [4, c. vi].

У 2005 г. ЮНЕСКА ратыфікавала Канвенцыю «Аб ахове і падтрымцы разнастайнасці форм культурнага самавыражэння», дзе асноўнымі мэтамі абвяшчаюцца: «a) ахова і заахвочванне разнастайнасці форм культурнага самавыражэння; b) стварэнне ўмоў для росквіту і свабоднага ўзаемадзеяння розных культур на ўзаемавыгаднай аснове; c) заахвочванне дыялогу паміж культурамі ў мэтах забеспячэння больш шырокіх і збалансаваных культурных абменаў ва ўсім свеце ў мэтах узаемапавагі культур і культуры свету...; i) умацаванне міжнароднага супрацоўніцтва і салідарнасці ў духу партнёрства, у прыватнасці, для пашырэння магчымасцей краін, якія сталі на шлях развіцця, у галіне аховы і заахвочвання разнастайнасці форм культурнага самавыражэння» [5, арт. 1].

Усе пазначаныя акты прыняты пасля Другой сусветнай вайны, што, як вядома, нанесла велізарныя страты культурным каштоўнасцям Еўропы: гістарычным гарадам, асобным помнікам архітэктуры, музеям. Акрамя таго, загінула пакаленне носьбітаў нематэрыяльных культурных каштоўнасцей: традыцый, абрадаў, песеннай і вуснапаэтычнай творчасці.

У параўнанні з «Афінскай хартыяй» 1933 года, прынятай па ініцыятыве Ле Карбюзье, пасляваенны пакет канвенцый скіраваны на ахову гісторыка-культурных каштоўнасцей у комплексе (каштоўнасці архітэктуры і мастацтва, народна-традыцыйнай культуры і інш.).

Адкрыты наднацыянальны статус дае магчымасць далучэння розным краінам усіх кантынентаў. Мір ва ўсім свеце і мір паміж культурамі рознай этнічнай, канфесійнай, расавай прыналежнасці – так можна падсумаваць асноўную ідэю пералічаных канвенцый ЮНЕСКА.

Распад СССР і пашырэнне Еўрасаюза ў канцы XX стагоддзя, з аднаго боку, абазначылі новыя праблемы ў сферы абароны і развіцця сусветнай культурнай прасторы, а з другога – паставілі канкрэтныя задачы перад міжнароднай супольнасцю і яе прадстаўнічымі арганізацыямі ў галіне культуры.

Надыход інфармацыйнай эпохі, фарміраванне глабальных эканамічных прастор, рынкаў абвастрылі канфлікт паміж глабальным і нацыянальным, авангардным і традыцыйным, масавым і самабытным. Камерцыялізацыя культуры не аслабіла міжканфесійныя і міжэтнічныя супярэчнасці. Спажывецкі характар поп-культуры натыкаецца на супраціўленне традыцый і звычаяў. Назіраецца культурная палярызацыя (на аснове хрысціянскіх, ісламскіх і іншых традыцый). Наплыў мігрантаў, дэмаграфічны крызіс на глебе працяглага эканамічнага крызісу паставілі вядучыя еўрапейскія краіны перад праблемай абароны нацыянальных культур, традыцыйных маральных і духоўных каштоўнасцей.

У святле пазначанага задачамі ААН, Еўрасаюза, ЮНЕСКА ў сферы аховы развіцця сусветнай культурнай разнастайнасці як асновы стабільнасці і росквіту цывілізацыі павінен стаць працяг работы па:

– захаванні нацыянальных моў, моўнай і дыялектнай разнастайнасці;
– ахове песеннай і вуснапаэтычнай спадчыны народаў і этнічных груп;
– ахове нематэрыяльнай культурнай разнастайнасці;
– пашырэнні структуры Спісу сусветнай культурнай спадчыны;
– пашырэнні спісаў славутых імён.

У маштабах Еўропы, Еўрасаюза і ЮНЕСКА павінны быць вызначаны меры па ліквідацыі дысбалансу ў адносінах аховы і рэвіталізацыі гісторыка-культурнай спадчыны заходніх і ўсходніх рэгіёнаў Еўропы.

Пажадана большая адкрытасць з боку Еўрасаюза ў адносінах да Беларусі і іншых краін Усходняй Еўропы для пашырэння культурнага абмену, інтэграцыі гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі ў інфраструктуру еўрапейскага турызму, у спісы сусветнай культурнай спадчыны.

Багатая культурная спадчына продкаў вызначыла высокі ўзровень і росквіт сучаснай беларускай культуры: народна-традыцыйнай і прафесійнай. На міжнародных фестывалях і конкурсах, выстаўках і біенале сучасныя беларускія артысты, музыканты, мастакі годна прадстаўляюць краіну. Еўрапейскія турысты і госці з усяго свету з цікавасцю знаёмяцца з Беларуссю, ахвотна наведваюць гарады, рэгіёны, запаведныя мясціны, помнікі, музеі. Ліквідацыя перашкод і развіццё культурнага супрацоўніцтва паміж Еўрасаюзам і Беларуссю паспрыяюць і культурнаму ўзбагачэнню Еўропы, многія культурныя карані якой бяруць пачатак з беларускай зямлі.

**Заключэнне**

Дзеля забеспячэння інавацыйнага развіцця культуры неабходна вырашэнне рада навуковых праблем.

1. Даследаванні агульных, рэгіянальных і лакальных рыс культуры павінны ўяўляць няспынны працэс. Менавіта так можна вырашыць праблему яркага, устойлівага аблічча нацыянальнай культуры як часткі сусветнай культурнай разнастайнасці.

Нацыянальная культура – сукупнасць рэгіянальных і лакальных асаблівасцей. Апошнія вызначаюць як культурнае, так і эканамічнае, дэмаграфічнае развіццё рэгіёнаў, стрымліваюць міграцыю моладзі ў гарады і цэнтр, стымулююць творчую ініцыятыву мясцовых прадпрымальнікаў, прыцягненне знешніх інвестыцый.

2. Захаванне і развіццё нацыянальнай культурнай самабытнасці патрабуюць пастаяннага навуковага аналізу тэндэнцый у прафесійнай культуры і мастацтве, суадноснасці ў іх традыцый і навацый, кансерватызму і авангарду. У міжваенны перыяд XX стагоддзя авангарднае мастацтва Беларусі, Віцебская школа аказалі вырашальны ўплыў на развіццё канструктывізму і авангардных школ Заходняй Еўропы і СССР. Навуковы абгрунтаваны прагноз развіцця прафесійных мастацтваў дазволіць стварыць заслон агрэсіўным і разбуральным уздзеянням так званай масавай поп-культуры, якая адмаўляе традыцыі і агульначалавечыя каштоўнасці.

3. Складанай праблемай яшчэ з часоў былога СССР з’яўляецца пераадоленне адмоўнага балансу суадносін ахovы і рэстаўрацыі помнікаў, страты і разбурэння іх першапачаткова аблічча. Варта скарыстаць методыку стварэння айчыннага Збору помнікаў (адзіны паспяховы праект, здзейснены ў былым СССР) і зрабіць яго перапрацаванае, дапоўненае новае выданне. Наспела выданне Збору рухомых помнікаў, многія з якіх ляжаць без рэстаўрацыі ў музейных запасніках, знішчаюцца ў царкоўных прыходах у выніку так званага паднаўлення і перапісвання.

Неабходна стварэнне нацыянальнага інвентару нематэрыяльных культурных каштоўнасцей і, нарэшце, нацыянальнага электроннага каталога і электроннай карты, адаптаваных да кантролю з дапамогай касмічнай навігацыі, трохмерных мадэлей помнікаў архітэктуры.

4. У сістэме адукацыі неабходна ўключыць у вучэбны працэс найноўшыя вынікі даследаванняў у галіне культуры, гісторыка-культурнай спадчыны, паходжання беларускага народа. Паглыбляць веды пра выдатных дзеячаў, іх уклад у сусветную культуру.

Варта адрадзіць традыцыю шэфства над помнікамі, летніх падарожжаў школьнікаў па памятных і славутых мясцінах, работу будатрадаў на аб’ектах культуры.

5. У сістэме інфармацыі на падставе сабраных за дзесяцігоддзі навуковых фондаў, калекцый і фундаментальных прац стварыць серыю тэм (відэа- і аўдыёперадач) старонак інтэрнэту дзеля папулярызацыі ўзораў нацыянальнай культуры, пазбягаючы спекулятыўных і псеўданавуковых сюжэтаў, эпатажных ток-шоу, якія ператвараюць аўтэнтычныя сюжэты ў відовішча, скажаюць сапраўды сакральны змест мастацкіх народных твораў.

Неабходна імкнуцца да чысціні роднай мовы, пазбягаць яе засмечвання замежнымі тэрмінамі і выслоўямі, пазбаўленымі духоўнасці і зместу.

6. Шырокім кластарам культуры з’яўляецца тэатральна-відовішчная дзейнасць. Праблемай застаецца месца нацыянальнага рэпертуару на сучаснай сцэне, нацыянальнай драматургіі, сцэнаграфіі, канцэртнай дзейнасці. Даследаванні пазначаных праблем у ракурсе еўрапейскага кан-

тэксту, пераклады і папулярызацыя беларускай літаратурнай класікі будуць спрыяць не толькі цікавасці еўрапейцаў, але і развіццю нацыянальнай драматургіі, тэатра, сцэнічнай культуры.

7. Пашырэнне выкарыстання нацыянальнай культурнай спадчыны ў сферы турызму – важны фактар развіцця культуры рэгіёнаў, стварэння эканамічных зон турысцка-рэкрэацыйнага тыпу, новых працоўных месцаў у галіне паслуг, развіцці мясцовай інфраструктуры.

## Літаратура


1. Конвенция «О защите культурных ценностей в случае вооруженного конфликта» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.spravka-jurist.com/base/part-rq/tx_xswtfy.htm. – Дата доступа: 21.07.2011.
2. Конвенция «О мерах, направленных на запрет и предупреждение незаконного вывоза, ввоза и передачи прав собственности на культурные ценности» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://docs.pravo.ru/document/view/19708675/. – Дата доступа: 21.07.2011.
3. Конвенция «Об охране всемирного культурного и природного наследия» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://whc.unesco.org/archive/convention-ru.pdf. – Дата доступа: 21.07.2011.
4. Международная конвенция об охране нематериального культурного наследия. Основные тексты. – Люксембург, 2011. – 103 с.
5. Конвенция «Об охране и поощрении разнообразия форм культурного самовыражения» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.ifapcom.ru/files/Documents/conv_cult_expression.pdf. – Дата доступа: 21.07.2011.
6. Доклад Президента Республики Беларусь Александра Лукашенко на четвёртом Всебелорусском народном собрании [Электронный ресурс]. – Режим доступа: www.president.gov.by/press101782.htm#doc. – Дата доступа: 21.07.2011.
7. Закон «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: www.pravo.by/webnpa/text.asp. – Дата доступу: 21.07.2011.
8. Закон «Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: www.pravo.by/webnpa/text.asp. – Дата доступу: 21.07.2011.
9. Пытанне аховы помнікаў перайшло ў новы якасны стан, і супакойвацца нельга // Звязда. – 2011. – 19 ліпеня. – С. 4.


*A. I. LAKOTKA*

**ACADEMIC SCIENCE FOR THE NATIONAL CULTURE DEVELOPMENT**

## Summary


Article is dedicated to the problems of ethnic traditions, language and identity preservation and development, which are guarantors for sustainable progress in the contemporary humanitarian space of mankind today.

Carefully the activities of the Center for Belarusian culture, language and literature researches in the field of conservation and translation of national historical and cultural heritage have been analyzed.

Also some recommendations for the improvement of humanitarian studies in this field have been developed and presented in the article.